**Вольны час**

# У бібліятэку — на сямейную нараду



**Сельская бібліятэка пасёлка Лясны Мінскага раёна неўзабаве пераедзе ў культурны цэнтр, які будуецца, а пакуль што размясцілася ў інтэрнаце.**

— Набыць усе літаратурныя навінкі ў дамашнюю бібліятэку немагчыма, — расказваюць яе чытачы. — Таму мы з вялікім задавальненнем карыстаемся кнігамі з камерцыйнага фонду. Больш таго, у бібліятэцы можна пакінуць заяўку на тую кнігу, якую хацелася б прачытаць, і ў хуткім часе яна абавязкова з'явіцца.

Толькі за першае паўгоддзе бібліятэка пасёлка зарабіла за кошт платных паслуг каля 740 тысяч рублёў, што дало магчымасць крыху абнавіць кніжныя фонды.

Бібліятэку наведваюць каля 2 тысяч чытачоў. А ў яе кніжным фондзе звыш 15 тысяч экземпляраў. У год выдаецца каля 40 тысяч кніг.

Бібліятэкары прапаноўваюць чытачам далучыцца да клубаў па інтарэсах, якія тут створаны. Для школьнікаў існуюць два аб'яднанні. Сябры "Сузор'я талентаў", якім кіруе загадчыца бібліятэкі Марына Даміно, захапляюцца літаратурай і самі пішуць вершы.

Клуб "Равеснік" існуе з 1993 года. Кіруе ім Любоў Адамовіч. Падлеткі збіраюцца на пасяджэнні, дзеляцца сваімі праблемамі, разам шукаюць шляхі іх вырашэння. Важна і тое, што ў рабоце клуба прымаюць удзел так званыя "цяжкія" падлеткі.

А ўдзельнікі клуба "Сямейны свет" дзеляцца вопытам сямейнага жыцця, праводзяць конкурсы, адзначаюць дні нараджэння і гадавіны вяселляў. Дарэчы, у гэтым клубе пазнаёміліся і стварылі сям'ю Сяргей і Ірына Бычкоўскія, якія ўжо выхоўваюць дваіх дзяцей.

Для сталых людзей створаны клуб "Залаты ўзрост", якім кіруе Ганна Навахрост. На яго пасяджэннях за кубкам чаю абмяркоўваюцца розныя жыццёвыя сітуацыі, праводзяцца цікавыя мерапрыемствы.

**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ.**



НА ЗДЫМКАХ: Галіна Аляксандраўна КАЗЛОВІЧ (дырэктар Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі); работа з наведвальнікамі.

Фота аўтара.

**Мінская праўда. – 8 верасня. – С.15.**